**Н. А. Ляйко,**
*прафесар кафедры інфармацыйных рэсурсаў,*
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт;*
**А. І. Фядорына,**
*дацэнт кафедры інфармацыйных рэсурсаў*

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ СПЕЦЫЯЛІСТА Ў ПРАЦЭСЕ ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ДАКУМЕНТАЎ»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнай мэтай прафесійнай адукацыі XXI ст. з’яўляецца падрыхтоўка кампетэнтнага, канкурэнтаздольнага спецыяліста, які добра валодае прафесіяй, здольны самастойна вырашаць вытворчыя задачы.

У адпаведнасці са стандартам вышэйшай адукацыі першай ступені па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках), аб’ектам прафесійнай дзейнасці спецыяліста з’яўляюцца тэхналагічныя працэсы ў бібліятэках, кніжных палатах і інфармацыйных цэнтрах, фарміраванне і выкарыстанне інфармацыйных рэсурсаў. Для гэтага спецыяліст павінен быць кампетэнтным у вытворча-тэхналагічнай дзейнасці, падрыхтаваным да вырашэння наступных прафесійных задач:

– аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі дакументаў і інфармацыі;
– стварэння і выкарыстання інфармацыйных рэсурсаў па розных сферах дзейнасці.

Кампетэнцыі ў дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў» рэалізуюцца шляхам практыка-арыентаванага навучання, якое з’яўляецца састаўной часткай вучэбнага працэсу і самастойнай работы студэнтаў.

Згодна з адукацыйным стандартам, у патрабаваннях да прафесійных кампетэнцый спецыяліста ўказанай вышэй спецыяльнасці падкрэсліваецца, што ён павінен:

– выконваць бібліятэчна-інфармацыйныя тэхналагічныя працэсы ў асяроддзі сучасных АБІС;
– ажыццяўляць каталагізацыю дакументаў і падтрымку электроннага каталога.

Для падрыхтоўкі такога спецыяліста неабходна, у першую чаргу, сфарміраваць матывацыю да бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, уменне вырашаць канкрэтныя задачы.

Пры вывучэнні дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў» вышэйназваныя пытанні мы разглядаем на першай уводнай лекцыі, падкрэсліваем важнасць і неабходнасць вучэбнай дысцыпліны, звяртаем увагу на яе практыка-арыентаваную накіраванасць, звязаную з фарміраваннем інфармацыйна-пошукавых сістэм, якія спрыяюць задавальненню запытаў карыстальнікаў інфармацыі.

Пэўнае месца ў вучэбным працэсе па каталагізацыі дакументаў належыць структурна-лагічным схемам. Інфармацыя, якая паказана ў выглядзе схем і табліц, мае шэраг пераваг у параўнанні з тэкставым пераказам вучэбнага матэрыялу. Пры тэкставай інфармацыі ў некаторых выпадках студэнтам складана ўявіць структуру асобных з'яў, выявіць істотныя сувязі паміж імі, звярнуць увагу на асобныя часткі, раздзелы і г. д. Матэрыял з выкарыстаннем структурна-лагічных схем успрымаецца лягчэй і запамінаецца. Выкарыстанне такіх прыёмаў актывізуе мысленне студэнтаў, у выніку чаго павышаецца эфектыўнасць успрымання новага матэрыялу.

Структурна-лагічныя формы выкарыстоўваюцца ва ўсіх раздзелах дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў»: «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне»; «Індэксаванне дакументаў»; «Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм»; «Аўтаматызацыя працэсаў каталагізацыі». Напрыклад: «Афармленне каталагізацыйнага запісу для алфавітнага каталога», «Прыклады загалоўкаў бібліяграфічнага запісу афіцыйных выданняў, якія ўключаюць назвы ўстаноў (арганізацый)», «Структура ББК», «Структура УДК», «Табліца знакаў УДК», «Фрагмент электроннага каталога Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», «Алгарытм пошуку дакумента ў электронным каталогу», «Фрагмент зводнага электроннага каталога сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі» і інш. Дадзеныя схемы прыведзены ў вучэбных дапаможніках па дысцыпліне «Каталагізацыя дакументаў» [3].

Вывучэнне дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў» студэнтамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый і факультэта завочнага навучання ажыццяўляецца праз методыку складання асобных яе працэсаў: фарміраванне бібліяграфічнага запісу дакументаў, сістэматызацыю і прадметызацыю. Правілы паказу гэтых працэсаў з'яўляюцца агульнымі як для традыцыйных, так і для машыначытальных інфармацыйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пошукавых сістэм (ІПС). На вучэбных занятках студэнты фарміруюць бібліяграфічныя запісы ў фармаце BELMARC. Дысцыпліна «Каталагізацыя дакументаў» з'яўляецца найважнейшай прыступкай да засваення машыначытальнай каталагізацыі. Для гэтага ў вучэбным працэсе выкарыстоўваюцца такія праграмныя сродкі АБІС, як ALIS Web, IRBIS, MARC SQL. На жаль, у дадзенай дысцыпліне недастаткова гадзін для больш глыбокага вывучэння фармату BELMARC. Асноўнае прызначэнне фармату BELMARC – гэта вызначэнне і ўніфікацыя структуры і напаўнення ўваходных бібліяграфічных запісаў зводнага электроннага каталога бібліятэк Беларусі і сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі, таму неабходна ўключыць у вучэбны план ФІДК і ФЗН дысцыпліну «Машыначытальная каталагізацыя». Распрацоўка дадзенай дысцыпліны звязана з вывучэннем машыначытальных бібліяграфічных фарматаў, а таксама паказу аўтарытэтных/нарматыўных запісаў. Выкарыстанне файлаў BELMARC/AUTHORITIES забяспечвае работу зводнага электроннага каталога бібліятэк краіны. Вывучэнне дысцыпліны «Машыначытальная каталагізацыя» дасць магчымасць забяспечыць падрыхтоўку кваліфікаванага спецыяліста ў галіне каталагізацыі, здольнага да якаснага вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

Адпаведнае месца ў засваенні матэрыялу студэнтамі належыць навукова-метадычнай дакументацыі дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў», якая забяспечана ўсімі неабходнымі вучэбна-метадычнымі матэрыяламі: тыпавой вучэбнай праграмай, вучэбнымі дапаможнікамі [3], вучэбна-метадычным комплексам і шэрагам публікацый. Усе матэрыялы знаходзяцца як у друкаванай, так і ў электроннай формах.

Трэба адзначыць, што студэнты таксама прымаюць удзел у стварэнні дадатковых вучэбных матэрыялаў, у прыватнасці пры вывучэнні тэмы «Універсальная дзесятковая класіфікацыя (УДК)». Для паглыбленага вывучэння канкрэтных тэм у межах самастойнай работы студэнты рыхтуюць прэзентацыі: «Стварэнне і развіццё УДК», «Асноўныя правілы індэксавання», «Выкарыстанне сінтаксічных знакаў УДК», «Уласцівасці і прынцыпы пабудовы. Сутнасць УДК» і інш. УДК адводзіцца недастатковая колькасць гадзін, таму што неабходна вывучаць і іншыя класіфікацыйныя сістэмы, якія выкарыстоўваюцца ў нашай краіне. Між тым, на сучасным этапе ў сувязі з аўта-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

матызацыяй і пашырэннем выкарыстання УДК у інфармацыйна-пошукавых сістэмах як абавязковай класіфікацыйнай табліцы прыйшоў час уключыць дысцыпліну «УДК як інфармацыйна-пошукавая мова» для вывучэння студэнтамі ўсіх форм навучання.

Для забеспячэння фарміравання прафесійных кампетэнцый спецыяліста і вырашэння тэарэтычных і практычных задач неабходна матывацыя студэнтаў; адпаведнае інфармацыйнае і метадычнае забеспячэнне дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў»; авалоданне ўменнямі і навыкамі, указанымі ў стандарце; павелічэнне колькасці заняткаў па раздзеле «Аўтаматызацыя працэсаў каталагізацыі»; вывучэнне дысцыпліны «Каталагізацыя дакументаў» на ФІДК і ФЗН дапоўніць дысцыплінай «Машыначытальная каталагізацыя»; увядзенне на ФІДК і ФЗН дысцыпліны «УДК як інфармацыйна-пошукавая мова» за кошт дысцыплін універсітэцкага блока.

Выкананне вышэйназваных рэкамендацый будзе садзейнічаць фарміраванню прафесійных кампетэнцый канкурэнтаздольнага спецыяліста ў сферы бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці, які можа творча вырашаць прафесійныя задачы.


*1.* Вышэйшая адукацыя. Першая ступень : спецыяльнасць 1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках) : ОСВО 1-23 01 11 – 2014. – Уведз. 11.01.2014. – Мінск : М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, 2014. – 41 с. – (Адукацыйны стандарт вышэйшай адукацыі).

*2. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Арганізацыя бібліятэчных каталогаў як інфармацыйна-пошукавых сістэм : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў устаноў выш. адукацыі па спецыяльнасці 1-23 01 11 Бібліятэказнаўства і бібліяграфія (па напрамках) / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2013. – 110 с.

*3. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2006. – 179 с.

*4. Ляйко, Н. А.* Каталагізацыя дакументаў. Індэксаванне дакументаў : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «бібліятэказнаўства і бібліяграфія» выш. навуч. устаноў / Н. А. Ляйко, А. І. Фядорына ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2010. – 114 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ